**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

Азарэвіч
Ганна Юр’еўна

# Айконімы Докшыцкага раёна: лексіка-семантычны і структурна-граматычны аналіз

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Дыпломнае даследаванне**

**Навуковы кіраўнік –**
**кандыдат філалагічных навук,**
**дацэнт Радзіваноўская Н.А.**

**Мінск, 2012**

# Рэзюме

**Азарэвіч Ганна Юр'еўна**

## Айканімія Докшыцкага раёна: лексіка-семантычны і структурна-граматычны аналіз

**Ключавыя словы:** айконім, айканімія, апелятыў, антрапонім, гідронім, тапонім, фармант, утваральная аснова, бязафікснае ўтварэнне, афіксальна-флексійнае ўтварэнне, флексійнае ўтварэнне, лексіка-семантычная група.

**Аб'ект даследавання** - тапанімічныя назвы Беларусі.

**Прадмет даследавання** - айконімы Докшыцкага раёна.

**Мэта даследавання:** зрабіць лексіка-семантычны і структурна-граматычны аналіз айконімаў Докшыцкага раёна.

**Задачы:** сабраць назвы населеных пунктаў Докшыцкага раёна; правесці лексіка-семантычную класіфікацыю айконімаў, вызначыць крыніцу паходжання ўтваральных асноў; ажыццявіць словаўтваральную класіфікацыю назваў, устанавіць спосабы і сродкі ўтварэння айконімаў.

**Практычная значнасць:** вывучэнне анамастыкі патрэбна для паглыблення ведаў пра наша мінулае, уяўленне пра засяленне сучаснай тэрыторыі Беларусі са старажытнасці да нашых часоў, пра прыродна-геаграфічныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы развіцця грамадства, пра кантакты беларусаў з суседнімі народамі. Матэрыялы даследавання могуць прымяняцца ў лексікаграфічных працах – пры складанні слоўнікаў, у вучэбным працэсе ў школах і ВНУ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ